# Шляхі прымянення лекавых раслін на Беларусі : міфалагічны аспект

***Зімодра Вікторыя Алегаўна , Скобелева Ганна Паўлаўна***
*Белорусский государственный медицинский университет, Мінск*
***Научный(-е) руководитель(-и) –*** *кандидат филологических наук, научный сотрудник* ***Носік Алеся Анатольеўна*** *, Белорусский государственный медицинский университет, Мінск*

**Введение**

Лекавыя расліны былі вядомы людзям яшчэ з далёкай мінуўшчыны. Спажываючы розныя плады, карані і зёлкі, чалавек пачаў заўважаць, што некаторыя з іх даюць палегку. Вопыт і назіранне дазволілі выявіць уласцівасці раслін, якія паступова ўвайшлі ў арсенал народнай медыцыны. У міфалогіі беларусаў ёсць створаныя багатай фантазіяй нашых продкаў расліны, якія адлюстроўваюць пэўныя паняцці і памкненні чалавека.

**Цель исследования**

Выявіць асноўныя шляхі выкарыстання лекавых раслін у залежнасці ад існуючых міфалагічных уяўленняў беларусаў.

**Материалы и методы**

Даследаваны спосабы ўжывання лекавых раслін на Беларусі. Выкарыстаны навуковыя кнігі і даведнікі "Лекавыя расліны ў комплексным лячэнні", "Полный справочник лекарственных растений» і іншыя. Міфалогія расліннага свету была даследавана дзякуючы вучэбнікам і энцыклапедыям па беларускай міфалогіі (В.С. Новак "Беларуская міфалогія", А.М. Ненадавец "Выявы міфалагічнага выраю" і іншыя). Расліны баранец звычайны, падбел, чабрэц і крапіва ўзяты для аналізу міфалагічнага і медыцынскага аспекту.

**Результаты**

Выяўлены самыя распаўсюджаныя спосабы выкарыстання лекавых раслін на Беларусі, а перш за ўсё – прыгатаванне настояў і адвараў. Даследаваны асаблівасці міфалогіі расліннага свету, паводле якіх усе расліны падзяляюцца на добрыя (карысныя) і нядобрыя (тыя, што перашкаджаюць весці гаспадарку). Указана, з дзейнасцю якіх багоў гэта было звязана – Белбога і Чарнабога. Адзначаны асноўныя напрамкі выкарыстання апісаных раслін. Падбел з'яўляецца патагонным і адхарквальным сродкам, выкарыстоўваецца пры запаленні слізістай абалонкі поласці рта і мачавога пузыра, а таксама пры лячэнні насмарку. Крапіва аказвае кроваспыняльны і сасудазвужальны эфект пры насавых і легачных крывацёках. Выкарыстоўваецца пры лячэнні анеміі, атэрасклярозу, рэўматызму, экземы і дэрматытаў. Чабрэц карысны пры захворваннях

суставаў, мышцаў, перыфірычнай нервовай сістэмы. Баранец - вельмі эфектыўны сродак пры лячэнні алкагалізму.

**Вывады**

Раслінны свет рознабакова адлюстраваны ў свядомасці людзей, што накладвае адбітак і на само жыццё. Праецыруючы на сучаснасць, мы з упэўненасцю можам канстатаваць, што нашы продкі даволі часта мелі правільнае ўяўленне пра лячэбныя ўласцівасці многіх раслін. Лепшым доказам таму з'яўляецца ўзнікненне новага напрамку медыцыны – фітатэрапіі.